№20 сакавік 2012

Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

АЛЬТЭРНАТЫВЫ Ў АДУКАЦЫІ:

Матэрыялы круглага стала ад 10 сакавіка 2012 г.

Круглы стол "Крызіс у адукацыі – пошукі шляхоў выйсця" сабраў вакол сябе як даследнікаў педагагічнай думкі, так і практыкаў сучаснага адукацыйнага працэсу: настаўнікаў і рэпетытараў, нефармальных адукатараў і супрацоўнікаў навукова-метадычных установаў, дасведчаных экспертаў і пачаткоўцаў. Мэтай сустрэчы сталася гутарка "не пра хібы, а пра магчымасці" – пра тое, якія шляхі і крокі даюць плён у пераадоленні праблемаў нашай адукацыі ў цяперашніх умовах.

ТЭМА І: ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ

(мадэратар Аляксандр Сядзяка)

Сядзяка: Якасць адукацыі – пытанне, якое заўсёды турбуе педагагічную грамадскасць. За апошнія змены ў сістэме адукацыі (маю на ўвазе скарачэнне тэрмінаў навучання з 12 год да 11, адпаведную змену навучальных планаў і праграм) дынаміка пагаршэння якасці адукацыі паскорылася. Гэта паказвае і цэнтралізаванае тэставанне. Што зараз можна зрабіць, каб спыніць гэты працэс?

Запрудскі: 20 год таму якасць адукацыі адназначна разумелася як веды плюс уменні плюс навыкі.

Сёння сюды дадаюцца актуальныя кампетэнцыі для паспяховага жыцця ў Еўропе і нашай Беларусі. Мае сэнс экспертыза якасці адукацыі менавіта з гэтых пазіцый.

У такім выпадку ўзмацняецца значэнне інавацыйных методык: якраз яны найбольш працуюць на авалоданне вучнямі актуальнымі кампетэнцыямі. Больш-менш у гэтым напрамку праца ідзе. Вялікі ўнёсак зрабілі грамадскія арганізацыі (семінары і кнігі на працягу апошніх 10 – 15 гадоў). Гэта заўважна па выніках конкурсу "Настаўнік года".

Ёсць такая праграма Мінадукацыі: "Інструкцыя эксперыментальна-інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь" *(Інструкцыя аб эксперыментальнай інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджана пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 08.12.2006 №121).* Менавіта ў гэты час завяршаецца напісанне школамі інавацыйных праектаў. Пры ўвядзенні праекта адміністрацыя будзе атрымліваць на 20% зарплаты больш, настаўнік – на 15%. Таму пішуць праекты, праходзяць экспертызы.

Таксама ёсць разуменне настаўнікаў – таму крыніцы інавацый усё ж не наверсе, а ў школах і ў настаўніках.

Палоннікаў: Якія прычыны таго, што змяншаецца якасць адукацыі?

Запрудскі: Па першае, іншае разуменне таго, што такое якасць адукацыі. Па-другое, замена профільнага навучання на факультатыўныя заняткі (яны праводзяцца ў другой палове дня – як нешта другараднае) паўплывала на тую частку, якая "веды – уменні – навыкі".

Сядзяка: Адмена 12-гадовага навучання – рашэнне, па сутнасці, не педагагічнае, а палітычнае. Неабходна было прынамсі дачакацца выпуску праз год, паглядзець на вынікі профільнага навучання і прааналізаваць іх. Так званыя "штрыхавыя" класы – страчаныя дзеці, якія не атрымалі адукацыі. Са свайго досведу магу сказаць: сярэдні бал ЦТ па фізіцы – 18 балаў. Пры чым фізіку здаюць далёка не ўсе, толькі тыя, хто рыхтаваўся спецыяльна, невыпадковыя дзеці. Гадоў пяць таму той жа сярэдні бал складаў 33 – 37 балаў.

У кожнай школе так званая якасць ведаў – рэгламентная лічба, якую павінен агучыць завуч, які займаецца навучальным працэсам (раней гэта былі вучні, якія вучацца на 4 і 5, цяпер – на 6 – 7 і вышэй). Яна, як была ў савецкі час – 40%, так і засталася ў школе. А вось што тычыцца выхаду, ЦТ па-за школай – маем што маем.

Палейка: Мне здаецца, мы адышлі ад таго, што абмяркоўвалі. Як можна параўноўваць ранейшую і цяперашнюю сістэмы адукацыі, калі грамадства памянялася? Працягваем маніторыць сістэму па старых прынцыпах. Нават той жа вынік ЦТ дае адносную карціну: узровень падрыхтаванасці адных вучняў адносна другіх.

Міністэрства, аднак, кажа, што ўсё добра. Можа, варта правесці незалежны маніторынг (звярнуцца, напрыклад, да сістэмы PISA)?!

А. Быстрык: Вось у мяне

Удзельнікі

Уладзімір Колас, ТБШ.

Тамара Мацкевіч, Nastaunik.nfo.

Алесь Лозка, ТБШ.

Міхаіл Гусакоўскі, Цэнтр праблем развіцця адукацыі БДУ.

Аляксандр Палоннікаў, Цэнтр праблем развіцця адукацыі БДУ.

Мікалай Запрудскі, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі.

Галіна Сухава, гімназія №5 г. Віцебска, клуб "Крыштальны журавель".

Святлана Аксючыц, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі.



Алена Радзевіч, Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі.

Вінцук Вячорка, ТБШ.

Наталля Ільініч, настаўніца гісторыі, сайт Aacenka.by.

Міхась Булавацкі, настаўнік матэматыкі, рэпетытар, арганізатар "Беларускага пацыфорства.

Пётра Садоўскі, мовазнавец, палітык і дыпламат, "Цэнтар Супольнасць".

Валер Мазынскі, рэжысёр, "Цэнтар Супольнасць".

Аля Дзяргай, "Цэнтр Пост".

Лявон Карповіч, настаўнік матэматыкі.

Аляксандр Сядзяка, настаўнік, ТБШ.

Алена Палейка, настаўніца гісторыі, "Клуб еўрапейскіх настаўнікаў".

Аляксандр Быстрык, настаўнік гісторыі.

Валянціна Быстрык, настаўніца англійскай мовы, рэпетытар.

*З поўнымі версіямі дакладаў удзельнікаў круглага стала "Крызіс у адукацыі – пошукі шляхоў выйсця" можна пазнаёміцца ў сеціве: http://www.nastaunik.info/*info/conference/

Круглы стол КРЫЗІС У АДУКАЦЫІ:

з сабой графік вынікаў тэставання па гісторыі Беларусі ад 2007 года. Праз 5 гадоў нічога не змянілася, усе вяршыні і падзенні засталіся. Міністэрства баіцца ўзяць на сябе адказнасць за працу ў школе *(цытуе)*: "Адзнака ў балах, атрыманая на ЦТ, гэта не пацверджанне школьнай адзнакі, а ўзровень дасягнення ведаў у параўнанні з ведамі іншых абітурыентаў. Тэсты не выходзілі за рамкі абавязковага мінімуму гістарычнай адукацыі". Мінімум 2007 года складанейшы за сённяшні, а графік вынікаў тэставання нязменны...

У большай ступені інавацыі да нас не дайшлі: неабходныя новыя падручнікі, новыя настаўнікі, новая структура школы. Сённяшняя структура школы дапускае ў выпускныя класы тых, хто не здольны пайсці далей у вышэйшую адукацыю.

Радзевіч: Нашая краіна не ўдзельнічала ў даследаванні PISA. Але паказальныя вынікі Расіі, якая апынулася ў аўтсайдарах, хаця Расія традыцыйна лічылася ў нас адной з мацнейшых. На першыя пазіцыі выйшла Фінляндыя. Даследаванні паказваюць, што нашыя вучні не ўмеюць чытаць, узаемадзейнічаць з інфармацыяй. Яны добра ўзнаўляюць фактычны матэрыял, яны добра падрыхтаваныя, але не ўмеюць узаемадзейнічаць з інфармацыяй, прадукаваць уласныя ідэі.

Усе рэформы ў адукацыі датычылі пэўных форм: на працягу шматлікіх гадоў мы змянялі падручнікі, распрацоўваліся метадычныя дапаможнікі, зусім не надаючы ўвагі асобе самога настаўніка. Якім настаўнік быў у 70-я гады (традыцыйны настаўнік, які павінен укладаць веды ў галовы дзяцей), такім ён і застаўся сёння. А цяпер ужо новыя патрабаванні, мы жывем у новай інфармацыйнай прасторы, ведаў робіцца болей і болей. Напэўна, трэба ўжо паглядзець інакш на сам працэс адукацыі – не столькі на вынік, колькі менавіта на працэс адукацыі. Тут я б хацела расказаць пра тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо. Тэхналогія пачала актыўна развівацца з 1996 года амерыканскімі навукоўцамі і знайшла добрае якаснае пацверджанне ў шмат якіх краінах. У Беларусі яна стала ўкараняцца з 2000 года і пачыналася з навучання настаўнікаў, іх падтрымкі. Г.зн. мы пайшлі знізу, навучылі некалькі пакаленняў настаўнікаў, якія на сённяшні дзень ужо з'яўляюцца мультыплікатарамі, працуюць у шматлікіх абсягах. Сама па сабе тэхналогія з'явілася ў адказ на інфармацыйныя выклікі, яе мэта – навучыць працаваць з інфармацыяй. Гэтую інфармацыю сартаваць, выбіраць галоўнае для сябе. Я лічу, што гэтая тэхналогія вельмі важная для аздараўлення і развіцця грамадства, пабудовы грамадзянскай супольнасці.

> Чалавекам, які крытычна мысліць, вельмі цяжка маніпуляваць.

Ён узброены аргументаванымі довадамі, можа зразумець, якая інфармацыя для яго важная. Можа яе сартаваць і выбіраць на грунце свайго ўласнага досведу. У заходнееўрапейскіх краінах вельмі шмат падручнікаў. Настаўнік мае права выбару альтэрнатыўных падручнікаў. Ён можа ўвогуле падручнікамі не карыстацца. Ён можа ведаць, як знайсці інфармацыю, як ёй скарыстацца. Ёсць інтэрнэт-рэсурсы, сучасныя электронныя падручнікі і проста артыкулы навукоўцаў, педагогаў, псіхолагаў. Такім чынам, я лічу,

> акцэнт павінен рабіцца на развіццё настаўніка, яго падтрымку з розных бакоў.

Можа, эфект будзе не такі хуткі, як нам хацелася, але тым не менш вынік будзе.

І тыя ж тэхналогіі трэба ўкараняць праз настаўнікаў.

Аксючыц: Вядома, шмат у нашай адукацыйнай прасторы залежыць ад асобы выкладчыка. Якога настаўніка мы разумеем, такі і вынік адукацыйнага працэсу. Хто сёння ідзе ў школу?

Паводле вынікаў тэставання, у педагагічныя ўстановы ідуць тыя, хто не паступіў літаральна нікуды. Рэйтынг педагагічных установаў даволі нізкі. Але хочацца закцэнтаваць тое, што ў адукацыйнай прасторы (буду казаць пра пачатковую школу, у сувязі са сваім навуковым даследаваннем) ёсць вялікі працэнт настаўнікаў высокаадукаваных. Так, у сённяшняга настаўніка забралі сродак навучання – падручнік па развіццёвым навучанні, які забаронены міністэрствам адукацыі як асноўны падручнік.

Але: калі настаўнік навучаны тэхналогіям і ён дасведчаны педагог, падручнік як сродак яму і не патрэбны. Такі працэнт педагогаў маленькі – але тым не менш. Так, у рамках майго эксперыменту ўдзельнічаюць 10 установаў адукацыі рэспублікі: гэта і Горкі Магілёўскай вобласці, і Магілёў, і Маладзечна, і ў Мінску чатыры ўстановы. І я бачу даволі высокі ўзровень настаўнікаў. У рамках свайго навуковага даследавання "Задачны падыход як сродак фармавання пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў" мы стараемся акурат навучыць настаўнікаў, даць ім інструментар, якім яны могуць скарыстацца і фармаваць у пачатковай школе калектыўнага суб'екта навучальнай дзейнасці, каб настаўнік старэйшай школы ўжо канкрэтна працаваў на фармаванне індывідуальнай дзейнасці навучэнца. На жаль, нашая школа працуе толькі на тое, каб навучэнец атрымаў пэўны аб'ём ведаў. Яна не вучыць навучэнца вучыцца. І атрымліваецца, што з гэтым вялізным аб'ёмам інфармацыі і ведаў дзіцё не прыстасаванае да жыцця ў сучасным грамадстве. І вось канкрэтна ў пачатковай школе мы ў эксперыментальнай дзейнасці выкарыстоўваем праектныя задачы, якія скіраваныя на ўменне карыстацца вядомымі спосабамі дзеяння - але не ў стандартнай, а ў жыццёвай сітуацыі. Гэта дазваляе за чатыры гады ў пачатковай школе сфармаваць даволі моцнага суб'екта навучальнай дзейнасці. Але ці гатова нашая сярэдняя школа прыняць такіх дзяцей – гэта вялікая праблема. Я ўдзячная, што ўлетку прайшла навучанне па актыўнай ацэнцы ды з'ездзіла ў Польшчу і хачу сказаць, што на ўсіх 10 пляцоўках працую на ўкараненне метаду актыўнай ацэнкі. У снежні настаўніца 22 гімназіі атрымала грант Мінгарвыканкама – вось такія вынікі па ўкараненню і развіццёвага навучання, і актыўнай ацэнкі.

В. Быстрык: Дарэчы, казалі пра поспехі Фінляндыі: дык вось, у фінаў няма адзнакаў увогуле.

Аксючыц: Ведаеце, я ўвогуле за адмену адзнакі як такога канчатковага выніка ацэньвання. Адзнака – гэта свайго кшталту пуга, якая ўплывае на дзяцей. Мы разумеем, што так ці інакш наш вучань у школе зматываваны: я вывучу верш, рашу задачу, бо я атрымаю адзнаку ў 10 балаў, 8 ці 7...

> Калі ў дзіцяці будзе ўнутраная матывацыя да навучання, то патрэбы ў адзнацы як такой у яго не будзе.

У першым і другім класе ў нас безадзнакавае навучанне, мы імкнемся, каб яно было якаснае. У трэцім-чацёртым класе ўсё ж такі ўводзіцца адзнака як вынік ацэньвання і яна нівелюе тыя перамогі, закладзеныя ў першым і другім класе.

А. Быстрык. На маю думку, на сённяшні дзень сістэма, якая павінна была актывізаваць матывацыю вучняў, не працуе. Вось афіцыйныя звесткі па Навагрудскім раёне: у 2006 годзе сярэдні бал – 6,86. Потым ідзе 7,01, потым 7,26, у 2009 годзе ўжо – 7,32. Адзнака вышэй за 7 стала агульная, але вучнем незаробленая і яго не стымулюе.

Мацкевіч: Хачу вярнуцца да крытэрыяў якасці. Крытэрыі якасці ацэнкі і адукацыі распрацаваныя ў Еўропе ўжо даўно. Гэтак званыя 8 груп базавых кампетэнцый зацверджаны ў 2006 годзе Саветам Еўропы і выступаюць як рэкамендцыйныя для ўсіх еўрапейскіх краінаў. З іх нашая школа развівае толькі матэматычныя кампетэнцыі (фармаванне навуковай карціны свету). Астатніх няма. Напрыклад, прадпрымальнасць – уменне пралічваць і браць на сябе рызыку. Чаму нашая школа не вучыць гэтаму? Ці

ПОШУК ШЛЯХОЎ ВЫЙСЦЯ

ўменне вучыцца на працягу ўсяго жыцця… Дык ці можам мы неяк данесці гэтыя базавыя кампетэнцыі, паўплываць на сістэму, каб да нас прыслухаліся? Другое пытанне: грамадскія арганізацыі не могуць уплываць на змест адукацыі. Фармаваць кампетэнцыі мы можам толькі праз методыкі. Пытанне да прысутных: ці нашая праца па метадычнай адукацыі настаўнікаў прынесла плён?

Запрудскі: Кампетэнтнасны падыход сапраўды ў свеце папулярны, і моцна працуе ў Фінляндыі. Артыкул 91 Кодэкса аб адукацыі якраз згадвае кампетэнтнасны падыход. І працуючы з дырэктарамі і намеснікамі, мы якраз абмяркоўваем: як зрабіць, каб гэты артыкул 91 запрацаваў? Яны пачынаюць разумець:

> каб дзецям было ў Беларусі добра, і з гэтымі дзецьмі астатнім беларусам было добра, трэба ведаць не толькі тое, што напісана ў падручніках.

Лепш за ўсё засвоеныя інфармацыйна-камп'ютарныя кампетэнцыі. З астатнімі кампетэнцыямі праблемы ёсць (напрыклад, з прававымі, грамадзянскімі). У праграмах і падручніках гэта не закладзена. Яны фармуюцца праз актыўныя метады навучання, дзякуючы працы таго ж "Цэнтра Супольнасць". Але хуткім такі плён быць не можа.

Ну і профільнае навучанне – не панацэя. Вучань жадаў бы паступаць у тэхналагічны ўніверсітэт, дзе здаюць хімію і матэматыку. Ніводная школа краіны не мела хімічна-матэматычнага класа. Былі фізічна-матэматачны, хімічна-біялагічны. Ці на геафак: здаюць геаграфію і матэматыку. Калісьці быў геаграфічна-матэматычны клас у Багамолавай (дырэктар мінскага ліцэя №2), дык яна збірала дзяцей з усяго Мінска…

Я шэсць гадоў займаўся так званым мультыпрофільным навучаннем, калі дзеці выбіралі для навучання на павышаным узроўні тры прадметы (напрыклад, хімія – матэматыка – беларуская мова). Гэтую мадэль мы выпрабоўвалі з 2001 года. А ўжо ў 2008 годзе па ёй працавалі афіцыйна, у адпаведнасці з загадам міністра. Былі напісаныя метадычныя рэкамендацыі па масавым выкарыстанні гэтай мадэлі. Гэта найлепшая мадэль, якая дае вучням магчымасці выбару. Пасля 2008 года яна была адменена, але мне падаецца, мы да яе вернемся.

Сядзяка: Падвядзем высновы секцыі. Наколькі я зразумеў, праблема якасці адукацыі факусуецца на якасці падрыхтоўкі настаўніка.

ТЭМА II: АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ АСЯРОДКІ

(мадэратар Тамара Мацкевіч)

Мацкевіч: Мы вялі гаворку пра якасць і "астраўкі нармальнасці". Пытанне да дырэктара беларускага гуманітарнага ліцэя: ці ўдаецца ліцэю ў такіх умовах выхоўваць чалавека з якаснымі ведамі ў еўрапейскім сэнсе?

Колас: Альтэртанытўная адукацыя – не толькі прыватныя школы. Альтэрнатыўная адукацыя – гэта і вуліца, і самаадукацыя, і тое, што прыходзіць праз медыі… Ці можа тут перамагаць афіцыйная школа? Наўрад ці. Ствараюцца падпольныя стандарты. Цяпер школа культывуе энцыклапедычны падыход да ведаў, у ёй не вучаць працаваць з інфармацыяй.

Галоўнае – які заказ дае дзяржава сістэме адукацыі. Той жа АМАП – людзі, якія неяк ведаюць і гісторыю, і грамадазнаўства.

Мацкевіч: Ці ўдаецца ліцэю ў такіх умовах выхоўваць чалавека з якаснымі ведамі ў еўрапейскім сэнсе?

Колас: Мы працавалі і ў дзяржаўнай сісэме адукацыі. У прынцыпе, гэта досвед не ва ўсім адмоўны. Прафесіяналы ў адукацыі разумелі ролю і ліцэя, і эксперыментальных пляцовак. Усю сістэму адразу мяняць немагчыма, непрафесійна. Трэба выпрацоўваць нейкі досвед.

На сапраўдную спецыялізацыю вучняў старэйшых класаў сістэма не пайшла. Савецкі антыгуманітарны і антыбеларускі сіндром пераадолець не атрымалася.

Што да ўзроўню ведаў – ён павінен адпавядаць адзнацы. У афіцыйнай сістэме дырэктар прымушае настаўнікаў "маляваць" адзнакі. У нас рэальныя веды адпавядаюць рэальным адзнакам. Гэта выяўляецца на ўступных іспытах і на экстэрнах. Па тым, як працуюць нашыя выпускнікі ў самых розных сферах.

Палоннікаў: Я неяк запытаў у знаёмай настаўніцы: што ты робіш на ўроках? Адказвае: збіраю тэлефоны. Сёння ў Мінску амаль 70% сем'яў маюць камп'ютар. Гадоў пяць таму гэта было недзе 50%.

> Амаль 70% інфармацыі сённяшнія маладзёны атрымліваюць з інтэрнэту – не з тэлебачання! Школа як крыніца інфармацыі займае апошнія месцы.

50% вучняў польскай педагагічнай акадэміі больш кампетэнтныя ў камп'ютарных рэаліях, чым іх выкладчыкі. Выходзіць, у настаўнікаў яны вучацца, як дастасавацца да сістэмы і пасля пра яе забыць. Атрымаць рэйтынгі, здаць іспыты – і ўсё. Адукацыя адбываецца ў іншым месцы. Мае знаёмыя з Польшчы кажуць: польская мова сыходзіць. Нашыя юнакі размаўляюць па-англійску. На маю думку, настаўнік павінен рабіць нешта іншае ў іншым месцы. Магчыма, трэба гуртавацца тым настаўнікам, для якіх не інстытут адукацыі, а адукацыя з'яўляецца сэнсам жыцця.

Мой асноўны тэзіс: грамадзянская супольнасць павінна адыграць сваю ролю ў гэтых альтэрнатыўных працэсах, у медыйных адукацыйных асяродках.

Мацкевіч: Такім чынам, нашыя дзеці ходзяць у школу – а адукацыю атрымліваюць у іншым месцы. Напрыклад, у рэпетытараў. *(Да Міхася булавацкага і Валянціны Быстрык:)* Спадар Міхась, спадарыня Валянціна, якія плюсы ў гэтай альтэрнатывы?

Булавацкі: Рэпетытарства выпраўляе школьныя праблемы. Рэпетытар павінен даць чалавеку тое, што яму трэба. Школьны прынцып роўнасці пераўтвараецца ў прынцып аднолькавасці. Я мару пра школу з гнуткімі тэрмінамі.

Запрудскі: Ці могуць рэпетытары вучыць кампетэнцыям?

Булавацкі: Гэта ўжо не нашая справа, а справа грамадства, стварыць такі попыт. Калі з'явіцца попыт на кампетэнцыі – з'явяцца і рэпетытары.

В. Быстрык: У мяне дваістае стаўленне да рэпетытарства. Першы мінус – неабходнасць дзіцяці плаціць за ўрок. Бацькі вучня плацяць за тое, за што ўжо заплацілі падаткамі. Другая праблема – у індывідуальнай працы ці працы малымі групамі няма той інтрыгі, таго драматызму. Да таго ж, няма пачуцця перамогі. Школа – жывая. А тут заўсёды ёсць схема, і час абмежаваны. І на лірычныя адступленні няма часу…

Страшэнны мінус – жахлівая занятасць дзяцей. Ім ужо ў старэйшых класах робіцца ўсё роўна, бо цяжка вытрымаць нагрузку. Абавязковыя прымусова-выхаваўчыя мерапрыемствы. Дзіця кажа: мяне не будзе два дні, рыхтуюся да вучнёўскай канферэнцыі. Што такое "рыхтуюся"? Настаўнік знаходзіць і дае дзіцяці тэкст. Значыць, першая задача – навучыцца гэты тэкст агучыць. А як ты на пытанні будзеш адказваць? Кажа: не ведаю… У дзяўчынкі з Брэста і дзяўчынкі з Навагрудка - адна і тая ж тэма і яны адзін у адзін голас аднолькавыя тэксты агучваюць.

Ці праходзіў у гімназіі конкурс "Знаёмства з гісторыяй": дзяцей дрэсуруюць мінімум месяц. Прыходзіць "судны дзень". А ў журы сядзяць людзі, якім патрэбны пэўны вынік. І настаўнік даходзіць да таго, што не саромеецца на вачах рабіць такія падтасоўкі, што дзеці кажуць: якая брыда! Таму на конкурс не пускаюць нікога! Журы і ўдзельнікі – усё. Ні іншыя школьнікі, ні бацькі не могуць прысутнічаць.

Яшчэ мінус – падтрымліваецца ідэя няроўнасці, сацыяльнай напружанасці.

З плюсаў: з'яўляецца магчымасць для развіцця настаўніка. Настаўнік зацікаўлены ў дасканаленні, каб прыцягваць вучняў. У выніку сярод настаўнікаў адбыўся натуральны адбор і найбольш паспяховыя атрымалі нейкі дадатак да заробка. Добры настаўнік – ужо не гарадскі

Круглы стол

КРЫЗІС У АДУКАЦЫІ:

жабрак, ён можа пракарміць сябе сваёй прафесіяй.

Дзіця атрымлівае больш грунтоўныя веды, можа здзейсніць сваю мару паступіць куды хоча і стаць кім хоча.

Ну і магчымасці самаарганізацыі прысутнічаюць. Мая знаёмая, напрыклад, пачынала як рэпетытар, цяпер зарганізавала ў Лідзе рэпетытарскі цэнтр "Прыватнае вучэбнае ўнітарнае прадпрыемства": працуе яна сама і яшчэ тры настаўнікі. Мы, з падтрымкай нашага ліцэя, маем магчымасць даць нашым дзецям бясплатную дапамогу. На пытанне "чаму?" адказваем: бо беларусы павінны дапамагаць беларусам.

Булавацкі: Вяртаючыся да пытання навучання грамадзянскім кампетэнцыям. У мяне пытанне мовы вырашаецца праз выбар вучня, але: на беларускай мове заняткі каштуюць вучню істотна ніжэй. Калі вучань і адказвае па-беларуску – яшчэ ніжэй.

Садоўскі: Было сказана пра PISA, пра кампетэнцыі. Я даволі добра ведаю нямецкі досвед. Любіў хадзіць па ўроках, па школах. Супрацоўнічаў пяць гадоў: ёсць такі ў Браўншвейгу Інстытут даследавання падручнікаў усяго свету. Завёз туды 46 кілаграм беларускіх падручнікаў. У іх там школьныя парламенты арыентуюцца на мясцовыя праблемы. Гэтак званы прынцып рэгіянальнай сацыялізацыі. Вучням прапаноўваецца: вось вам праграма па беспрацоўі, рыхтуйце. Чатыры гадзіны на гэты семінар адводзіцца, на спрэчкі. Хто хоча, урадавую пазіцыю адстойвае, хто хоча, прафсаюзную.

Мацкевіч: Наталля Ільініч – настаўнік вышэйшай катэгорыі, якую пазбавілі працы ў афіцыйнай сістэме адукацыі за перакананні, якая два гады вядзе барацьбу за права застацца ў прафесі. Наталля, што Вы можаце сказаць калегам пра альтэрнатывы і магчымасці?

Ільініч: Я падрабязна апісала свой шлях у артыкуле, які знаходзіцца на сайце Настаўнік.info *(http://www.nastaunik.info/news/?id=6551)*. Але пераможцай сябе не адчуваю.

Палейка: Наташа, назаві тры плюсы твайго цяперашняга стану!

Ільініч: Па-першае, я засталася ў прафесіі, зарэгістравалася рэпетытарам і маю пяць вучняў. Шкадую, што не зарэгістравалася адразу пасля звальнення. Павышаю сваю кваліфікацыю, супрацоўнічаю з Таварыствам беларускай школы, вяду метадычны сайт "Актыўная айцэнка" *(www.aacenka.by)*. Па-другое, я адчула моцную салідарнасць з боку калег і грамадства – толькі грашовых пераводаў атрымала 201! Ну і па-трэцяе, маю больш вольнага часу і мая гаспадарка дагледжана нашмат лепш.

ТЭМА III. НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І АДУКАЦЫЯ

(мадэратар Вінцук Вячорка)

Вячорка: Нацыянальная культура і адукацыя – трэцяя тэма нашай сустрэчы. Хаця, безумоўна, паводле важнасці яна б мусіла быць першай.

Тэкст, у прадмове да якога гаварылася *(цытуе)*: "Найважнейшай асаблівасцю канцэпцыі нацыянальнай школы ёсць сістэматычна ажыццёўлены творчы сінтэз педагагічнага ўсясветнага досведу і роднай культурнай традыцыі. Практычна адзіным цывілізаваным сродкам адраджэння новай Беларусі можа стаць стварэнне такой сістэмы адукацыі, асноўнаю задачаю якой стане ўкараненне індывіда ў яго роднай культурнай традыцыі, якая ператвараецца ў духоўную крыніцу сённяшняга і будучага развіцця" *(Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі // Адукацыя і выхаванне. 1995. №10. С. 89 – 126. Па-рус. гл. http://charko.narod.ru/tekst/konc/vnik.htm)*. Інакш кажучы, нацыянальнае беларускае – гэта не факультатыўны кампанент, а сутнасць, падстава, прызма, праз якую пераламляецца і ўсясветны досвед. *(Да Гусакоўскага:)* Ну дык, спадар Міхась, ці не зашмат рамантызму было тады? Гэта быў вельмі добры час, усе думалі, што збудаванае тады становіцца падмуркам і вельмі хутка на падмурку будзе будавацца дом, будыніна, са сценамі, вокнамі (абавязкова вялікімі), дахам, каб не ліло. Але далоў сантыменты! Як вы цяпер глядзіце на той досвед? Ці не страціла актуальнасці тая праца?

Гусакоўскі: Я вельмі ўдзячны, што запрошаны на размову.

І вельмі задаволены тым, што пачуў. Тэкст вельмі добра сфармуляваны і наўрад ці будзе патрэба ў ім нешта перарабляць. Я мяркую, што каб нацыянальная сістэма адукацыі жыла, яна павінна мець сваю філасофію.

І над гэтым трэба адмыслова працаваць. Сістэматычна, не ад выпадку да выпадку. Вельмі складаныя працэсы ў свеце, і вельмі складана ўладкаваная адукацыя. У гэтым сэнсе нават сёння шмат хто спрабуе апеляваць да філасофскіх развагаў, каб знайсці нейкія аргументы. І гэта невыпадкова.

Задача, сфармуляваная тут – фармаванне сацыякультурнай ідэнтычнасці, заснаванай на беларускай нацыянальнай традыцыі, – гэтая задача застаецца. Мне здаецца, яна яшчэ будзе дастаткова доўга актуальнай. Гэты працэс, які абазначаны як базавы для беларускай нацыянальнай сістэмы адукацыі, беларускай нацыянальнай школы, базавы працэс ідэнтыфікацыі, у прынцыпе наўрад ці можа цяпер патрапіць пад нейкі радыкальны сумнеў. Хутчэй за ўсё, яго трэба цяпер ускладняць. Яго трэба мультыплікаваць, разрозніваць. У гэты працэс трэба ўвесці дадатковыя разрозненні, каб стала больш зразумела, што ж рабіць.

Тады было досыць агульнае ўяўленне, што такое ідэнтыфікацыя: гэта фармаванне нейкага ўмення, каб можна было адрозніць сваё ад чужога. Для таго часу гэтага было дастаткова.

Сёння працэсы значна ўскладніліся. Сёння мы маем сваіх беларусаў, якія прысвоілі сабе права біць іншых па галаве – беларусы! Толькі таму, што ў іх тут *(паказвае на грудзі)* нешта напісана. Сёння закладаюцца нейкія іншыя структуры, якія выбухнуць заўтра. І зноў, можа быць, павядуць нас не туды. Трэба ўважлівей прыглядзецца: што складваецца, якія структуры? Як у гэтым удзельнічаць, як адрозніваць пшаніцу ад куколя, набываць нейкія сродкі, каб можна было ўсведамляць гэтыя адрозненні і больш свядома паводзіцца? Большай задачы філасофія ніколі не ставіла: разумець, у якой сітуацыі ты знаходзішся – і рашаць, што можна зрабіць.

Учора я выпадкова знайшоў у інтэрнэце спасылку на кніжку нобелеўскага лаўрэата па эканоміцы Акерлофа і яго вучаніцы Крэнтан *(George Akerlof, Rachel E. Kranton)* "Эканоміка ідэнтычнасці". Пафас гэтай працы ў тым, што ідэнтычнасць сёння ёсць фактар, які вызначае эканамічныя паводзіны індывіда. Цалкам неэканамічная, здавалася б, ідэя. Аказваецца, ідэнтычнасць можа фармаваць структуры паводзінаў і структуры патрэбаў, якія могуць развіваць грамадства.

Садоўскі: Пратэстанты жывуць багацей, чым каталікі...

Гусакоўскі: У гэтым сэнсе каштоўнасць ідэнтычнасці вельмі вялікая. Мы яе ў той далёкі час, калі пісалася канцэпцыя, разумелі як сацыяльна-псіхалагічную ўстаноўку, цяпер жа вядзецца пра тое, што гэты важны культурны феномен мае яшчэ большае значэнне.

Сёння ў культуры адбываюцца некалькі працэсаў, на якія я хацеў бы звярнуць увагу і крытычна да іх паставіцца.

Што мяняецца ў разуменні ідэнтычнасці і ў працэсах фармавання ідэнтычнасці?

Я абазначу тры працэсы. <u>Першы – індактрынацыя</u>: навучанне некага дактрыне без уключэння крытычнага ўспрыняцця. Па дарозе сюды я ўбачыў у парку два білборды: "Я люблю Беларусь" і "Разам мы – Беларусь". Увесь час, як мой позірк на іх натрапляе, у мяне паўстае адно і тое ж пытанне: хто гэты "я"? І як гэта ён "любіць"?

Я не хачу да гэтага лозунгу далучацца – да гэтага "я", якое на білбордах, я не належу! У мяне іншае "я". Тэма індактрынацыі (ідэалогія, якая ўводзіцца ў навучальныя курсы) аперуе вельмі важным пачуццём – пачуццём патрыятызму. Але я б хацеў,

ПОШУК ШЛЯХОЎ ВЫЙСЦЯ

каб у гэтым пачуцці былі адрозненні, адрозненні свайго, спецыфічнага стаўлення да Беларусі. Сёння неабходна, каб узнікала свая сімволіка, якая б нараджала іншае стаўленне да сваёй традыцыі. Не афіцыйна-фармальная. Бо тая, якая на бігбордах – прафануе само патрыятычнае стаўленне.

Другі працэс: кансьюмерызм. Спажывецтва. Таксама мае шмат розных значэнняў, адно з іх станоўчае: рух грамадзян ці дзяржаўных арганізацый за пашырэнне правоў спажыўцоў і ўзмацненне іх уздзеяння на прадаўцоў і вытворцаў. Гэта значыць, спажыўцы маюць права выказваць прэтэнзіі вытворцу. Гэта ідэя, закладзеная і ў паняцці якасці адукацыі. Але тут адбываецца падвойная аперацыя: з аднаго боку, адукацыя пагражае пераўтварыцца ў паслугу, г.зн. быць прададзенай. І ў той жа час адукацыя – гэта такая сухая рэшта, якая ніколі не можа быць трансфармаваная ў грошы. Ці вымераная колькасным чынам, эканамічнымі сродкамі. Сёння ў апісанні адукацыі спрэс назіраецца эканамічны слэнг, прычым адкрыты. Ён прысутнічае ў тэрміне "якасць". Якасць адукацыі – чыста эканамічнае, менеджарскае слова. Фармаванне стаўлення да адукацыі як да нечага важнейшага, чым набыццё любой кампетэнцыі, - больш моцны, на маю думку, тэзіс у нацыянальнай школе, чым фармальныя нормы, да якіх мы заклікаем.

Трэці працэс – віртуалізацыя ідэнтыфікацыі. Віртуалізацыя ў слоўніках апісваецца цікавым чынам: стварэнне пэўнага кшталту ўяўленняў пра свет з дапамогай тэхнічных сродкаў. У сувязі з гэтым паўстае досыць цікавы феномен (пра гэта казаў калега Палоннікаў) – спроба фармавання ідэнтычнасці, якая носіць характар камп'ютарнай. Тэрмін, на які я хацеў бы звярнуць вашую ўвагу, – воблачная ідэнтычнасць. Каб было зразумела, магу прывесці прыклад: калі адзін камп'ютар дасылае запыт іншаму камп'ютару – ён яго здзяйсняе праз самы кароткі шлях. Знаходзіць вольны сервер і праз яго перадае інфармацыю. На наступны дзень гэта можа быць зусім іншы шлях. Воблачная ідэнтычнасць гэтаксама кожны раз іншая. Яна ёсць, але яна складаецца з цалкам розных элементаў, і межы яе няпэўныя.

Апошняе, чым бы я хацеў скончыць: калі мы пісалі канцэпцыю нацыянальнай школы, мы пісалі яшчэ і канцэпцыю ліцэя, яго мадэль. Там вялася гутарка пра тое, што задача ліцэя – сфармаваць лідэраў. Мы спрабавалі апісаць якасці, якія павінны мець гэтыя лідэры. Сёння да гэтых якасцяў можна дадаць яшчэ адну важную ўласцівасць – уменне ствараць фарматы, якія аб'ядноўвалі б як мага большую колькасць людзей, здольных да сацыяльнай актыўнасці.

Вячорка: Дзякуй, спадар Міхась. Яшчэ ў той прадмове гаварылася *(цытуе)*: "выяўленне і вызначэнне ўласнай мэты і ўласнага інтарэсу становіцца сёння дзейсным чыннікам самаарганізацыі і адраджэння нацыі, прынцыпам сацыяльнай палітыкі дзяржавы Беларусі". У гэтым рэчышчы таксама трактавалася і ўзгадванне свабодных грамадзянаў, якія сваю свабоду рэалізоўвалі дзеля сваёй дзяржавы Беларусі. Відаць, праблема, пра якую гаварыў спадар Гусакоўскі – праблема "ідэнтыфікацыі з чым" – таксама і лінгвістычная, семантычная.

> Дзяржава Беларусь і краіна Беларусь сёння аказваюцца розныя.

Дзяржава Беларусь зусім не абавязкова атаесамляе сябе з краінай Беларуссю. І адсюль праблема ва ўспрыманні вось тых публічных лозунгаў: што такое гэтая Беларусь, якую я люблю… З дзяржавай Беларуссю і краінай Беларуссю атаесамляў і атаесамляе сябе Беларускі гуманітарны ліцэй.

Колас: У працяг тэмы пра альтэрнатыўнасць ліцэя. І калі мы пісалі канцэпцыю, і сёння – мы з'яўляемся лакмусам стаўлення дзяржавы да пэўных каштоўнасцяў, на якіх і ліцэй грунтаваўся, і дзяржава павінна была будавацца. На вялікі жаль, сёння гэтыя каштоўнасці не тое каб адмаўляюцца, але стаўленне да іх такое савецкае. Ужываюцца падвойныя стандарты. І без палітыкі тут не абысціся. Ёсць кан'юктура, якая мае пад сабой эканамічны грунт: хочаш нафты – гучы "па-русскі". Людзі, пазбаўленыя таго, пра што мы кажам, у якіх адбілі самаідэнтыфікацыю, могуць абсалютна абыякава рэагаваць на ўсе гэтыя трансфармацыі на дзяржаўным узроўні: ад "саюзнай дзяржавы" да губерняў урэшце рэшт.

Што такое нацыянальная дзяржава? Усё павінна ў ёй быць як у людзей. І стаўленне да мовы, і статус дзяржаўнай мовы, мовы тытульнай нацыі. На вялікі жаль, у нас на дзяржаўным узроўні гэтага няма, у сістэме адукацыі гэтага няма. Менавіта таму ліцэй цяпер – гэта альтэрнатыва, прычым абсалютна нефармальная, якую немагчыма нават зарэгістраваць.

Мы з вуліцы прыйшлі ў сістэму адукацыі. Пачыналі як проста нядзельны ліцэй пры Таварыстве беларускай мовы. Гэта была цалкам прыватная грамадзянская ініцыятыва. І тое, што паступіла прапанова ад Міністэрства адукацыі, сведчыць, што там таксама былі пэўныя працэсы. І мы тады далі сабе абяцанне: як толькі пачнецца ціск, не будзе магчымасці рабіць тое, у што мы верым, – мы сыдзем зноў на вуліцу. Так яно і атрымалася. Мы ведаем, што самыя фантастычныя, неверагодныя перамены ў гэтым жыцці магчымыя. І мы спадзяемся, што яшчэ ўсё памяняецца. Але зараз гэтая сістэма сапраўды трансфармуе наступнае пакаленне. Яна не толькі вучыць, яна і сацыялізуе. Кансервуе пэўныя мадэлі. І задача нашая засталася: рыхтаваць лідэраў, тых, хто будзе нешта мець, мець альтэрнатыву, у бок якой павінна мяняцца ўсё грамадства.

Вячорка: І, напэўна, будзе мець каштоўнасную матывацыю. Што ні кажы, за дваццаць гадоў змянілася пакаленне і тэхнічна-інфармацыйны кантэкст. Магчыма, трэба даследаваць змены ў фізіялогіі ўспрымання ў дзяцей.

> Асаблівасці перцэпцыі мяняюцца тысячагоддзямі і дзясяткамі тысячагоддзяў – а тут літаральна на вачах.

Калі чалавек з трох гадоў валодае "мышкай" лепей, чым уласным языком – гэта не можа не адлюстроўвацца на яго псіхіцы, гэта азначае, што традыцыйныя вербальныя спосабы і матрыцы ўплыву перастаюць працаваць. За дваццаць гадоў адбыліся і грамадска-палітычныя змены. І ўсё гэта разам узятае не магло не паўплываць на настрОі, філасофію, якая пануе сярод сённяшніх дзяцей, іхных бацькоў. Пытанне: ці выхаванне – гэта функцыя школы? Выхаванне наагул – і нацыянальна-культурнае ўзгадаванне. Я ўзяў падручнік геаграфіі для восьмага класа (дачка вучыцца): "краіны замежнай Азіі" – патлумачце мне, калі ласка, гэта што для беларуса?

Настаўнікі-практыкі, калі ласка, канкрэтызуйце. Спадарыня Алена Палейка.

Палейка: Сярод адміністрацыі школ, настаўнікаў, дзяцей і іх бацькоў пануе спажывецка-канфармісцкая, цалкам прагматычная псіхалогія. Яна праяўляецца адначасова як у патрабаваннях, так і ў прыстасоўванні да сітуацыі, але цалкам выключае актыўную жыццёвую пазіцыю. Прычым такая псіхалогія цалкам задавальвае настаўніка, які адчувае сябе ахвярай, але нічога не робіць дзеля таго, каб змяніць сітуацыю. Адсюль і сентэнцыі кшталту: "А што я магу зрабіць? Вы ж самі ўсё вельмі добра разумееце". Згодна з сацыялагічным даследаваннем, якое штогод праводзіцца ў школе сярод дзяцей і настаўнікаў, галоўнымі каштоўнасцямі былі названыя: сям'я, стабільнасць і справядлівасць. Пры гэтым такія каштоўнасці, як салідарнасць і прыватная маёмасць, не набралі ніводнага голасу, а свабода заняла толькі чацвёртае месца ў рэйтынгу. Гэтыя вынікі сведчаць пра ўнутраны дысананс паміж абыякавасцю і голасам сумлення, паміж жаданнем быць, як усе, і цікавасцю да нармальнага, добрага і нацыянальнага, якое змагаецца. Ёсць настаўнікі, якія " адзін у полі воін" – яны змагаюцца далей. Ёсць установы, якія вучаць інтэрактыўным метадам. Сёння нам не хапае маладых, не хапае студэнтаў, аспірантаў,

Круглы стол

КРЫЗІС У АДУКАЦЫІ: ПОШУК ШЛЯХОЎ ВЫЙСЦЯ

якія б тут прысутнічалі. Кропка біфуркацыі наступае. Нашая галоўная мэта – яе не прапусціць.

Вячорка: Калі спадарыня Галіна Сухава адкрывала для сваіх, і не толькі для сваіх, вучняў Максіма Гарэцкага, яна сфармулявала ягоны прарыўны пасыл: беларус не гаротны і няшчасны, ён з тых, хто ведае, што яму патрэбна, ён кемлівы і ўпарты. Выбіраць нацыянальную ідэнтычнасць – сёння значыць кідаць пэўны выклік.

Сухава: Хто такі настаўнік ва ўяўленні традыцыйных беларусаў? Чалавек, які лёгка прымае інфармацыю і яе перадае. У сучаснай школе большасць настаўнікаў мае комплекс выдатніка. Настаўнік ведае, як правільна. А ўсё, што правільна, яму прадпісалі. І ён разумее, што выканаць гэта – практычна немагчыма. І што рабіць прыстойнаму чалавеку, выдатніку?

Праблема, мне здаецца, у гэтым: ёсць як трэба, ведаем, што парушаць нельга ні ў якім разе, і настаўнік – такі зашуганы конь. Хаця ўся сітуацыя вакол патрабуе мяняцца. Я прайшла конкурс "Настаўнік года" і цяпер магу сказаць, што перамагае толькі той чалавек, які не такі, як усе. Я люблю беларускую літаратуру, мне падабаецца здзіўляць. Цяпер я ў клубе "Крыштальны журавель", мы выязджаем і нашая

> асноўная функцыя – не вучыць, а здзівіць. Паказаць: вось так – нельга, але калі вам падабаецца, то рабіце!

Ёсць сучасная прафесія – іміджмэйкер. Іміджам настаўніка ніхто не займаўся, толькі савецкі кінематограф, дзе настаўнік заўсёды быў такі прыдуркаваты чалавек: прытрымліваўся нейкіх правілаў, жыццё мяняецца, а ён на гэтыя змены ў жыцці не рэагуе. Кансерватар. 50 адсоткаў грамадства лічыць: гэта і ёсць настаўнік. Ён ведае, як трэба, і гэты мінімум данясе. І ёсць яшчэ 50 адсоткаў, яны лічаць, што настаўнік – гэты той, хто вучыць "як".

> Дзякуючы нефармальнай адукацыі і да мяне нарэшце гэта прыйшло: важна вучыць не "чаму", а "як".

Дзякуючы семінарам, актыўным метадам навучання. Калі калегі-настаўнікі гэта зразумеюць, то, мне здаецца, сітуацыя зменіцца. Цяпер у педагогі ідуць абітурыенты – далёка не выдатнікі. Магчыма, у гэтым няма катастрофы. Бо школа – спецыфічны асяродак. Калі настаўнік там зачапіўся, ён будзе настаўнікам. Незалежна ад дыплома, бо тут больш практычныя, чалавечыя навыкі задзейнічаны. Калі ствараць імідж настаўніка – ён павінен быць разнапланавым. На добры лад, прадзюсарам настаўніка павінны быць бацькі. А мы гэты кампанент вельмі моцна губляем, грамадскасць не задзейнічаем. Школа – закрыты інстытут. Любая спроба знаёмства звонку ўспрымаецца як чарговая праверка.

Сядзяка: У 2010 годзе ў мінскай школе адбываўся маніторынг. Глядзелі, як у школе пасля ўсіх гэтых рэформаў. Размаўлялі ў класе з дзецьмі. Дырэктарка дала інспектарцы найлепшы клас. Было пытанне: калі была б магчымасць працягваць навучанне за мяжой – ці вучыліся б вы ў Беларусі? 100% самага лепшага класа адказалі: мы бы паехалі. Дзяржава не павінна выпускаць адукацыю са сваіх рук, бо галоўная задача адукацыі – выхаванне грамадзяніна сваёй краіны. Калі нашая дзяржаўная адукацыя гэтую справу не робіць, гэта павінна рабіць адукацыя альтэрнатыўная. Не можа быць выхавання патрыётаў на грунце чужой мовы і зневажання нацыянальных каштоўнасцяў.

Вячорка: Дзякуй, спадар Аляксандр. Такім чынам: нацыянальныя інтарэсы, нацыянальныя каштоўнасці – з гледзішча ў тым ліку еўрапейскага досведу. Наколькі мы адсталі ў гэтым сэнсе? Якая мадэль дзяржавы ў нас выбраная? Спадар Пётра Садоўскі.

Садоўскі: Пафас майго прысуду такі: давайце мы разам напішам кніжку! Нам патрэбна папулярнае выданне пра нацыянальныя каштоўнасці ў сістэме сучасных гуманістычных ведаў – настольная кніга для настаўнікаў, вучняў ды іх бацькоў з умоўнай назвай "Хто мы і дзе мы знаходзімся?"

Лозка: Не будзем удавацца ў падрабязнасці, на якой дакладна стадыі знішчэння і самазнішчэння знаходзіцца нацыянальная культура, мова беларусаў, але тое, што яна знаходзіцца ў даволі крытычным стане і набліжана да клінічнай мяжы – не выклікае сумнення.

Са школьнай праграмы знік прадмет «Айчынная і сусветная культура», які прадугледжваў вывучэнне спецкурсаў і факультатываў фальклорна-этнаграфічнага кірунку. Акрамя таго, школы цяпер пазбаўленыя паглыбленага і профільнага навучання, г. зн. зніклі этнакласы, дзе можна было развіваць мастацкія навыкі, нацыянальную свядомасць. Закрываюцца адпаведныя факультэты і кафедры ва ўніверсітэтах. Развіваецца іншая ідэалогія.

Прааналізуем дапаможнік "Народная педагогика", рэкамендаваны рэдакцыйна-выдавецкай радай БДПУ і выпушчаны ў 2007 годзе *(Воронецкая, Л. Н., Мелешко, Ю. В. Народная педагогика. Минск: Красико-Принт, 2007)*. Дапаможнік напісаны на рускай мове і рэкамендаваны настаўнікам-прадметнікам, класным кіраўнікам, выкладчыкам ВНУ, студэнтам педагагічных спецыяльнасцяў, аспірантам.

Ва ўступным артыкуле робіцца абстрактная спроба абгрунтаваць псіхалагічна-педагагічныя перадумовы фармавання нацыянальнай свядомасці асобы. Дэкларуецца, што аўтары засноўваюцца на высновах беларускіх вучоных, якія займаюцца праблемай нацыянальнай самасвядомасці (і ўказваюцца сапраўды беларускія крыніцы), але асноўны раздзел "Методика формирования национального сознания школьников на материале народной педагогики" ім супярэчыць.

У дапаможніку пададзена праграма з дзесяці тэмаў і метадычна-тэхналагічнае забеспячэнне. У першай з іх *("Народная педагогика: ее воспитательный потенциал")* аўтары ўмудрыліся абысці няёмкае наўпростае пытанне: свядомасць якой нацыі яны будуць фармаваць у беларусаў, чыю культуру будуць ім насаджаць? У сцэнары занятку прысутнічаюць звычайныя пытанні пра Радзіму, продкаў у трэцім калене, народныя святы і культуру, а таксама прыводзіцца выраз: "Народ осуждал тех, кто по своей воле очутился на чужой стороне – «Кто язык и веру менял, тот мать предавал»".

У другой тэме "Славянский фольклор как средство воспитания личности" нават са спісу літаратуры можна прыйсці да высновы, што славяншчына – гэта толькі руская культура.

У тэме пра гісторыю рускага этыкету, які, як вядома, адрозніваўся ў розных фармацыях і эпохах, педагог даведаецца пра сенсацыйныя падзеі: Кастрычніцкая рэвалюцыя адмяніла этыкет... і рэабілітаваны ён у савецкую эпоху ў 30-я гг. – гады "адлігі", калі пачалі наладжвацца міжнародныя сувязі...

Іншыя тэмы наўпрост указваюць на рускую народную музыку, харэаграфію і г.д. Усё гэта падаецца як роднае.

Зразумела, што вывучэнне чужой культуры не з'яўляецца заганай, а наадварот, мераю выхаванасці, але насаджэнне праз адукацыю ў свядомасць дзяцей чужой культуры і свядомае перавыхаванне ў іншую нацыянальнасць – гэта і ёсць гвалтоўная асіміляцыя.

Вячорка: Тэмаў, якія сёння загнаныя ў парадак дня, хопіць на дзесяць калегіяў Міністэрства адукацыі. Некаторыя з іх павінны быць сумесныя з Міністэрствам культуры ці Міністэрствам эканомікі.

> Трэба разглядаць прагаворанае сёння як анонс на больш звужаных тэматычныя круглыя сталы.

Мацкевіч: Дыскусія будзе працягвацца ў інтэрнэт-прасторы. Калі спатрэбіцца, будзем збірацца і ў іншым складзе, з іншымі пытаннямі.

Расшыфроўка аўдыёзапісу - С.Літвінчук

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта **Nastaunik.info**
Адрас для допісаў: **nastaunik.info@gmail.com**
Наклад 200 асобнікаў